Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”
Кафедра беларускай літаратуры

**Г.В. Навасельцава**

# АСНОВЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖУРНАЛІСТА

***Практыкум***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*
*2012*

УДК 070(075.8)
ББК 76.01я73
Н15

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 1 ад 21.03.2012 г.

Аўтар: выкладчык кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **Г.В. Навасельцава**

Р э ц э н з е н т:
дацэнт кафедры беларускай літаратуры УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, кандыдат філалагічных навук *Г.П. Харошка*

**Навасельцава, Г.В.**

**Н15** Асновы творчай дзейнасці журналіста : практыкум / Г.В. Навасельцава. – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – 25 с.

Вучэбнае выданне асвятляе гісторыю стварэння “Віцебскага летапісу” М. Панцырнага і С. Аверкі, яго месца ў кантэксце гарадскога летапісання Беларусі XVII–XVIII стст., фактаграфічную і мастацкую вартасць. Адрасавана студэнтам філалагічных спецыяльнасцей універсітэта і прыхільнікам старажытнай літаратуры.

Практыкум “Асновы творчай дзейнасці журналіста” адрасаваны студэнтам I–II курсаў спецыяльнасці “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка” дзённай формы навучання.

Складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі агульнаадукацыйнага стандарта і тыпавой вучэбнай праграмы “Асновы творчай дзейнасці журналіста” па спецыяльнасці “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка”, рэгістрацыйны № ТД-А 167 ад 03.04.2009 г.

**УДК 070(075.8)**
**ББК 76.01я73**

© Навасельцава Г.В., 2012
© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012

Репозиторий ВГУ

## ЗМЕСТ

I. УСТУП ……………………………………………………….. 4

II. МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ “АСНОВЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖУРНАЛІСТА” ……….

III. АСНОЎНЫ ЗМЕСТ МОДУЛЯЎ ……….…………...... 6

IV. ЛІТАРАТУРА …………………………………............ 17

V. ПЫТАННІ ДА ТЭАРЭТЫЧНАГА ЭТАПА ЭКЗАМЕНУ … 19

VI. ПРАГРАМА БЕСПЕРАПЫННАЙ КАРЭСПАНДЭНЦКАЙ ПРАКТЫКІ ………………………………...……….. 21

Репозиторий ВГУ

# I. УСТУП

Вывучэнне дысцыпліны “Асновы творчай дзейнасці журналіста” з’яўляецца важным этапам набыцця журналісцкай адукацыі, адлюстроўвае сучасны стан, асноўныя тэндэнцыі развіцця сродкаў масавай інфармацыі і дзейнасці журналіста як суб’екта творчага працэсу.

Дысцыпліна непасрэдна звязана з такімі прадметамі, як “Асновы творчай дзейнасці журналіста”, “Тэорыя і методыка журналісцкай творчасці”, “Прафесійная этыка журналіста”.

Мэта выкладання дысцыпліны – даць студэнтам трывалыя веды пра агульныя заканамернасці і працэсы журналісцкай дзейнасці.

Прафесійная падрыхтоўка будучых супрацоўнікаў СМІ патрабуе вырашэння наступных задач:

- ➢ Навучыць будучых спецыялістаў самастойна працаваць у журналісцкім калектыве;
- ➢ Сфарміраваць уменне выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці;
- ➢ Даць уяўленне пра структуру творчага працэсу, сістэму сродкаў маўленчай выразнасці ў медыя-тэксце.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

- ❖ Агульныя заканамернасці творчай дзейнасці журналіста;
- ❖ Асаблівасці працы з журналісцкім творам;
- ❖ Асноўныя метады збору інфармацыі;
- ❖ Адрозненні журналісцкай і літаратурна-мастацкай творчасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен умець:

- ❖ Аналізаваць журналісцкі тэкст на розных узроўнях;
- ❖ Прымяняцб атрыманыя веды пры напісанні ўласных твораў;
- ❖ Выкарыстоўваць у журналісцкіх матэрыялах разнастайныя сродкі маўленчай выразнасці.

Практыкум “Асновы творчай дзейнасці журналіста” адрасаваны студэнтам I–II курсаў спецыяльнасці “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка” дзеннай формы навучання, складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі агульнаадукацыйнага стандарта і тыпавой вучэбнай праграмы “Асновы творчай дзейнасці журналіста” па спецыяльнасці “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка”, рэгістрацыйны № ТД-А 167 ад 03.04.2009 г. Курс разлічаны на 88 аўдыторных гадзін (30 лекцыйных, 58 лабараторных).

## II. МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВЫ ПЛАН ДЫСЦЫПЛІНЫ “АСНОВЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЖУРНАЛІСТА”

| | | |
|---|---|---|
| **Модуль 1**<br>Тэкст як асноўны прадукт журналісцкай творчасці | **8 лекцыйных гадзін** | **14 лабараторных гадзін** |
| **Модуль2**<br>Тэхналогія падрыхтоўкі твораў для друкаваных выданняў | **8 лекцыйных гадзін** | **16 лабараторных гадзін** |
| **Модуль 3**<br>Сістэма журналісцкіх жанраў | **8 лекцыйных гадзін** | **14 лабараторных гадзін** |
| **Модуль 4**<br>Прафесійная дзейнасць журналіста і культура маўлення | **6 лекцыйных гадзін** | **14 лабароторных гадзн** |

Репозиторий ВГУ

# III. АСНОЎНЫ ЗМЕСТ МОДУЛЯЎ

## Модуль 1. Тэкст як асноўны прадукт журналісцкай творчасці

***Тэма 1. Творчая дзейнасць журналіста: тэарэтычныя аспекты***

Прадмет і задачы курса, яго месца і роля сярод іншых журналісцкіх дысцыплін. Агульная характарыстыка сродкаў масавай інфармацыі. Сістэма СМІ Беларусі.

Сутнасць паняццяў “творчасць”, “творчая асоба”, “творчае мысленне”. Агульныя заканамернасці і формы творчай дзейнасці журналіста. Журналісцкая творчасць і літаратурна-мастацкая: агульнае і адрознае.

Прафесійныя абавязкі і прафесійныя характарыстыкі асобы журналіста. Журналісцкае майстэрства: этапы станаўлення.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Дайце агульную характарыстыку сродкаў масавай інфармацыі.
2. Ахарактарызуйце сістэму СМІ Беларусі
3. Акрэсліце сутнасць паняццяў “творчасць”, “творчая асоба”, “творчае мысленне”.

Практычная частка

4. Вызначце тэму, пра якую вам хацелася б пісаць. Збярыце факты і звесткі, звязаныя з цікавай для вас тэмай. Вызначце ў ёй галоўнае і другараднае.
5. Напішыце эсэ на тэму “Журналіст у сучасным свеце”.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Вылучыце агульныя заканамернасці і формы творчай дзейнасці журналісты.
2. Раскрыйце агульнае і адрознае ў журналісцкай творчасці і літаратурна-мастацкай.

Практычная частка

3. Прааналізуйце тэксты розных аўтараў маладзёжных выданняў з пазіцыі індывідуальнага стылю.
4. Прааналізуйце творы любімых пісьменнікаў з пазіцыі індывідуальнага стылю.

Репозиторий ВГУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце прафесійныя абавязкі журналіста.
2. Раскрыйце этапы станаўлення журналісцкага майстэрства.

Практычная частка

3. Падбярыце з газет матэрыялы, у якіх, на ваш погляд, журналіст парушыў прафесійную этыку. У чым заключаецца гэта парушэнне? Абгрунтуйце сваю думку.

***Тэма 2. Журналісцкі тэкст як сродак масавай камунікацыі***

Інфармацыя як асноўная катэгорыя тэксту. Віды інфармацыі (зместава-канцэптуальная, зместава-фактуальная). Спецыфіка і функцыі медыя-тэксту.

Асноўныя спосабы атрымання інфармацыі. Сістэма інфармавання журналістаў. Тыпы крыніц інфармацыі, іх характарыстыка. Спецыфіка інфармацыйнага асяроддзя.

Факт у журналістыцы і мастацкай літаратуры. Ацэнка факта ў журналісцкім творы. Паняцці “рэальны факт” і “вербальны факт”. Прынцыпы адбору фактаў.

Навіна як аснова журналістыкі факта. Навіна і сенсацыя. Спецыфіка лагічнай будовы журналісцкага твора.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце розныя віды інфармацыі.
2. Акрэсліце спецыфіку медыя-тэксту.

Практычная частка

3. Напішыце эсэ на тэму “Інфармацыйнае стагоддзе”.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Назавіце асноўныя крыніцы інфармацыі.
2. Прааналізуйце сістэму інфармавання журналістаў.

Практычная частка

3. Складзіце спіс кампетэнтных крыніц інфармацыі ў вашым горадзе (раёне).
4. Выканайце тэст камунікатыўных здольнасцей.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Акрэсліце факт у журналістыцы і мастацкай літаратуры.
2. Укажыце асноўныя прынцыпы адбору фактаў для журналісцкага твора.

Рэпазіторый ВГУ

Практычная частка

3. Прааналізуйце журналісцці тэкст, дзе закранаецца важная праблема. На аснове якіх фактаў пабудаваны тэкст? Ці дастаткова гэтых фактаў для раскрыцця тэмы? На колькі выразна выяўлена праз факты пазіцыя аўтара?

4. Напішыце заметку на аснове галоўных фактаў.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 4

Тэарэтычная частка

1. Дайце азначэнне навіны і сенсацыі.

2. Акрэсліце спецыфіку лагічнай будовы журналісцкага твора.

Практычная частка

3. Прасачыце сэнсава-лагічныя сувязі ў двух розных матэрыялах на адну і тую ж тэму. Дзе логіка і аргументацыя больш пераканаўчыя? Чаму?

4. Напішыце эсэ на тэму “Навіны – наша прафесія”.

*Кантроль па першым модулі: выкананне рэдакцыйнага задання ўніверсітэцкай газеты “Мы і час”.*

*Напісанне эсэ на тэму “Маё першае рэдакцыйнае заданне”.*

## Модуль 2. Тэхналогія падрыхтоўкі твораў для друкаваных выданняў

***Тэма 1. Спецыфіка журналісцкага твора***

Твор і тэкст: дыфферанцыяцыя паняццяў. Узаемадзеянне розных відаў творчасці. Дыскурс у кантэксце журналісцкай творчасці.

Паняцце публіцыстыкі і спецыфіка публіцыстычнага твора. Адметнасць яго прачытання і разумення.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце ўзаемадзеянне розных відаў творчасці.

2. Раскрыйце паняцце дыскурсу ў кантэксце журналісцкай творчасці.

Практычная частка

3. У прапанаваных падшыўках газет знайдзіце інфармацыйныя матэрыялы з лідам. Вызначце тыпы лідаў, ацаніце іх дарэчнасць і выразнасць. Ахарактарызуйце лепшыя і горшыя інфармацыйныя матэрыялы.



Рэпазіторый ВДУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Раскрыйце паняцце публіцыстыкі.

2. Дайце азначэнне публіцыстычнаму твору.

Практычная частка

3. Уважліва прааналізуеце змест аднаго нумару трох розных газет (рэспубліканскіх або рэгіянальных). Выпішыце адтуль інфармацыю пра любых вядомых асоб, чые справы або словы прыцягнулі вашую ўвагу, здаліся цікавымі, незвычайнымі. У адвольнай форме стварыце ўласны тэкст пра цікавага чалавека. Тэкст павінен утрымліваць цытаты, спасылкі, каментарыі. Паспарайцеся зрабіць яго запамінальным.

***Тэма 2. Ідэя журналісцкага твора***

Паняцце ідэі журналісцкага твора. Стадыі стварэння матэрыялу (фарміраванне, канкрэтызацыя і рэалізацыя задумы, распрацоўка тэмы праверка фактаў, аўтарскае рэдагаванне матэрыялу). Сістэма фактаў у журналісцкім творы.

Структура і кампазіцыя журналісцкага тэксту. Тыповыя віды кампазіцыі. Знешняя і ўнутраная кампазіцыя.

Журналісцкі твор і функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Раскрыйце паняцце ідэі журналісцкага твора.

2. Ахарактарызуйце стадыі стварэння журналісцкага матэрыялу.

Практычная частка

3. Прааналізуйце сістэму падачы фактаў у журналісцкім творы з раённага і рэспубліканскага выдання. Параўнайце іх.

4. Знайдзіце аналітычны артыкул у рэспубліканскім выданні. Назавіце пяць-сем ключавых слоў, якія вызначаюць яго змест. На падставе ключавых слоў напішыце лід да матэрыялу.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Прасачыце патрабаванні да структуры і кампазіцыі журналісцкага тэксту.

2. Ахарактарызуйце тыповыя віды кампазіцыі.

Практычная частка

3. Стварыце падрабязны план работы над тэмай будучай публікацыі. Вызначце кола крыніц інфармацыі.

Рэпазіторый ВГУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Вызначце ролю функцыянальна-сэнсавых тыпаў маўлення ў працэсе творчай дзейнасці журналіста.

2. Ахарактарызуйце стылёвую спецыфіку апавядання, апісання, разважання.

Практычная частка

3. Стварыце тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне, тэкст-разважанне на выбраную вамі актуальную тэму.

4. Напішыце заметку на выбраную вамі тэму з сінкрэтычным выкарыстаннем розных тыпаў маўлення.

***Тэма 3. Асноўныя патрабаванні да журналісцкага твора***

"Запаведзі" журналісцкай дзейнасці. Усходняя і заходняя мадэлі. Інфармацыйная культура грамадства і спецыфіка журналісцкай творчасці.

Фактары папулярнасці (эфектыўнасці) журналісцкага твора. Методыка працы над журналісцкім тэкстам.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Сфармулюйце "запаведзі" журналісцкай дзейнасці.

2. Прасачыце ўзаемасувязі інфармацыйнай культуры грамадства і спецыфікі журналісцкай творчасці.

Практычная частка

3. Падрыхтуйце і правядзіце гульню-прэс-канферэнцыю на тэму "Інфармацыйная культура сучаснага грамадства". Абавязковая дэталёвая распрацоўка роляў усіх удзельнікаў.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Назавіце асноўныя фактары папулярнасці (эфектыўнасці) журналісцкага твора.

2. Пералічыце асноўныя патрабаванні да методыкі працы над журналісцкім тэкстам.

Практычная частка

3. Прапануйце ўласную методыку працы над журналісцкім тэкстам.

4. Складзіце правілы рэдагавання ўласных тэкстаў.

***Тэма 4. Функцыі загаловачнага комплексу.***

Віды загалоўкаў. Намінатыўная, інфарматыўная, камунікатыўная, рэкламная функцыі загалоўкаў. Правілы для загалоўкаў на газетнай паласе і ў інтэрнэт-выданні.



Репозиторий ВГУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Назавіце віды загалоўкаў.

2. Раскрыйце намінатыўную, інфарматыўную, камунікатыўную, рэкламную функцыі загалоўкаў.

Практычная частка

3. Прааналізуйце загалоўкі ў рэспубліканскіх і рэгіянальных перыядычных выданнях. Адзначце найбольш удалыя.

4. Прапануйце свае варыянты загалоўкаў да асноўных матэрыялаў нумару.

*Кантроль па другім модулі: прапанаваць уласную тэму і зрабіць па ёй публікацыю ва ўніверсітэцкай газеце “Мы і час” (або любым рэгіянальным выданні).*

*Напісанне эсэ “Мая тэма ў журналістыцы”.*

## Модуль 3. Сістэма журналісцкіх жанраў

***Тэма 1. Асноўныя інфармацыйныя жанры журналісцкай творчасці***

Паняцце жанру ў журналістыцы. Жанраўтваральныя фактары ў СМІ рознай тыпалогіі. Адметнасць працы над матэрыяламі розных жанраў і мэтавая аўдыторыя СМІ.

Асновы навасційнай, праблемна-аналітычнай, мастацка-публіцыстычнай журналістыкі. Навасційная журналістыка і праца рэпарцёра. Навіна – аснова інфармацыйных жанраў. Спецыфіка інфармацыйных жанраў (заметка, рэпартаж, інтэрв’ю).

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Назавіце асноўныя жанраўтваральныя фактары ў сучасных СМІ.

2. Раскрыйце узаемасувязі праблемна-тэматычнага зместу, жанравай палітры выдання і яго мэтавай аўдыторыяй.

Практычная частка

3. Прааналізуйце ўзаемасувязі праблемна-тэматычнага зместу, жанравай палітры выдання і яго мэтавай аўдыторыі на прыкладах якаснага і масавага друку.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Акрэсліце спецыфіку рэпарцёрскай працы.

2. Ахарктарызуйце заметку як інфармацыйны жанр СМІ.



Репозиторий ВГУ

Практычная частка

3. На аснове аператыўных звестак папулярных інтэрнэт-сайтаў падрыхтуйце замекі пра важныя грамадска-сацыяльныя падзеі.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце рэпартаж як інфармацыйны жанр СМІ.
2. Ахарактарызуйце інтэрв'ю як інфармацыйны жанр СМІ.

Практычная частка

3. Падрыхтуйце рэпартаж на выбраную вамі культурную тэму (наведайце выставу ў любым музеі, паглядзіце любы тэатральны спектакль і г.д.).
4. Падрыхтуйце і правядзіце інтэрв'ю-гульню "Рэпарцёр атрымаў заданне…".

***Тэма 2. Асноўныя аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя жанры журналісцкай творчасці***

Агульнае ўяўленне пра аналітычныя жанры. Артыкул. Аналітычнае інтэрв'ю. Партрэтнае інтэрв'ю. Каментарый і карэспандэнцыя. Агляд і агляд СМІ.

Галоўныя характарыстыкі замалёўкі, нарыса, эсэ. Фельетон і памфлет у сучаснай журналістыцы. Адметнасць спецыялізаванага гумарыстычна-сатырычнага выдання.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце сістэму аналітычных жанраў СМІ.
2. Ахарактарызуйце артыкул як асноўны аналітычны жанр СМІ.

Практычная частка

3. Прааналізуйце артукул у рэспубліканскім выданні паводле прапанаваных схемы. Звярніце ўвагу на асноўныя прыкметы аналітычнага матэрыялу.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Назавіце асноўныя жанраўтваральныя прыкметы партрэтнага інтэрв'ю.
2. Назавіце асноўныя жанраўтваральныя прыкметы праблемнага інтэрв'ю.

Практычная частка

3. Знайдзіце на старонках рэспубліканскіх выданняў партрэтнае і праблемнае інтэрв'ю. Зрабіце іх кампаратыўны аналіз.



Репозиторий ВГУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце каментарый як прыём і як жанр журналісцкай творчасці.

2. Ахарактарызуйце агляд і агляд СМІ як жанры.

3. Раскрыйце асноўныя жанраўтваральныя прыкметы карэспандэнцыі.

Практычная частка

4. Знайдзіце на старонках рэспубліканскіх выданняў і прааналізуйце каментарый у аглядзе, аглядзе СМІ, карэспандэнцыі.

5. Напішыце каментарый на актуальную для маладзёжнай аўдыторыі тэму.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 4

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце нарыс як жанр журналісцкай творчасці.

2. Ахарактарызуйце фельетон і памфлет як жанры.

Практычная частка

3. Знайдзіце і прааналізуйце нарыс на старонках сучаснага друку.

4. Напішыце фельетон на любую актуальную тэму.

*Кантроль па трэцім модулі: напісанне і публікацыя матэрыялу ў любым інфармацыйным жанры ва ўніверсітэцкай газеце "Мы і час" (або рэгіянальным выданні).*

*Напісанне замалёўкі на тэму "Калі б быў рэдактарам…".*

## Модуль 4. Прафесійная дзейнасць журналіста і культура маўлення

### *Тэма 1. Асноўныя патрабаванні да маўлення журналіста*

Інфармацыйнае поле і інфармацыйная норма ў СМІ. Моўная норма. Маўленчая культура журналіста. Публіцыстычны стыль і газетна-публіцыстычны падстыль. Ідывідуальны стыль журналіста.

Даступнасць мовы СМІ – галоўная ўмова эфектыўнасці журналісцкага выступлення. Дакладнасць маўлення: фактычная і тэарэтычная. Багацце маўлення журналіста як сведчанне майстэрскага валодання словам. Правільнасць маўлення. Зместавая і стылістычная дарэчнасць маўлення. Маўленчая сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і яе ўплыў на мову СМІ.

Выразнасць і лаканічнасць публіцыстычнага стылю. Экспрэсіўнасць мовы публіцыстычных тэкстаў. Маўленчыя стандарты. Слоўныя штампы і шаблоны ў медыя-тэксце.



Репозиторий ВГУ

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Пералічыце патрабаванні да маўленчай культуры журналіста.

2. Ахарактарызуйце публіцыстычны стыль.

3. Назавіце ўласцівасці індывідуальнага аўтарскага стылю.

Практычная частка

4. Знайдзіце і прааналізуйце матэрыялы на старонках сучаснага друку, якія вылучаюцца індывідуальным журналісцкім стылем.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Пералічыце патрабаванні да эфектыўнасці журналісцкага выступлення.

2. Ахарактарызуйце фактычную і тэарэтычную дакладнасць маўлення.

3. Раскрыце характар уплываў на мову СМІ.

Практычная частка

4. Напішыце заметку пра моўную палітру выбранага вамі раённага або рэспубліканскага перыядычнага выдання.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Назавіце асноўныя асаблівасці публіцыстычнага стылю.

2. Ахарактарызуйце маўленчыя стандарты на газетнай паласе.

Практычная частка

3. Прааналізуйце слоўныя штампы і шаблоны ў вабраным вамі выданні. Вызначце яго маўленчы стандарт.

4. Напішыце замалёўку з выкарыстаннем экспрэсіўна-вобразных сродкаў.

***Тэма 2. сродкі маўленчай выразнасці і спецыфіка іх выкарыстання ў медыя-тэксце***

Маўленчыя сродкі ўздзеяння на свядомасць: стылістычныя фігуры і тропы. Полістылізм як асноўная прыкмета мовы друку. Узбагачэнне і абнаўленне мовы беларускіх СМІ за кошт дыялектызмаў і наватвораў. Умовы і прычыны выкарыстання запазычанай лексікі ў айчынных СМІ. Размоўныя словы, жаргон: плюсы і мінусы іх выкарыстання ў журналісцкім творы.

Репозиторий ВГУ

Стылістычныя фігуры ў газетным тэксце. Віды стылістычных фігур-пытанняў. Функцыі рытарычных пытанняў у медыя-тэксце. Стылістычныя фігуры як сродкі падтрымання кантакту з аўдыторыяй.

Тропы ў журналісцкім творы. Метафарызацыя мовы СМІ. Алегорыя, метанімія, сінекдаха, прычыны іх выкарыстання. Каламбур як сродак маўленчай выразнасці і прыцягнення ўвагі да медыя-тэксту. Элементы мас-культуры ў друку (рэмінісцэнцыі, алюзіі). Паўторы розных тыпаў, іх роля ў публіцыстычным творы. Паўтор як адзін з найбольш важных стылеўтваральных кампанентаў газеты.

Інтэртэкстуальнасць як моўна-стылёвая прыкмета сучаснай публіцыстыкі. Формы праяўлення інтэртэкстуальнасці ў розных відах творчасці (мастацтве, літаратуры, журналістыцы). Крыніцы інтэртэкстуальнасці. Негатыўная інтэртэкстуальнасць. Пашырэнне ў друку тэкстаў, напісаных на журналісцкім жаргоне.

## ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце маўленчыя сродкі, якія ўплываюць на чалавечую свядомасць.
2. Раскрыйце, якім чынам размоўныя словы і жаргон выкарыстоўваюцца у журналісцкіх матэрыялах.
3. Прасачыце шляхі абнаўлення мовы беларускіх СМІ.

Практычная частка

4. Прааналізуйце любое рэгіянальнае выданне на прадмет выкарыстання ў ім дыялектызмаў і новатвораў.

## ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце спецыфіку стылістычных фігур у газетным тэксце.
2. Раскрыйце функцыі рытарычных пытанняў у медыя-тэксце.

Практычная частка

3. Прааналізуйце любое выданне на прадмет выкарыстання стылістычных фігур.
4. Напішыце заметку, надаючы асаблівую ўвагу стылістычным фігурам.

## ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

Тэарэтычная частка

1. Прааналізуйце прычыны метафарызацыі мовы СМІ.
2. Раскрыйце спецыфіку выкарыстання рэмінісцэнцыі і алюзіі ў газетным тэксце.

Репозиторий ВГУ

3. Ахарактарызуйце паўтор як адзін з найбольш важных стылеўтваральных кампанентаў газеты.

Практычная частка

4. Прааналізуйце тэндэцыі метафарызацыі мовы СМІ на прыкладзе любога перыядычнага выдання.

ЛАБАРАТОРНЫЯ ЗАНЯТКІ № 4

Тэарэтычная частка

1. Ахарактарызуйце інтэртэкстуальнасць як моўна-стылёвую прыкмету сучаснай публіцыстыкі.

2. Раскрыце змест негатыўнай інтэртэкстуальнасці.

3. Назавеце прыкметы тэкстаў, напісаных на журналісцкім жаргоне.

Практычная частка

4. Прааналізуйце любое выданне на прадмет выкарыстання ў ім інтэртэкстуальнасці.

5. Стварыце інфармацыйны матэрыял з выкарыстаннем у ім інтэртэкстуальнасці.

*Кантроль па чацвёртым модулі: напісанне і публікацыя рэпартажу ва ўніверсітэцкай газеце “Мы і час” (або рэгіянальным выданні).*

***У якасці выніковага кантролю выконваецца экзаменацыйная творчая праца на прапанаваную тэму.***

Репозиторий ВГУ

## IV. ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная*

1. Ахмадулин, Е.В. Основы теории журналистики / Е.В. Ахмадулин. – Ростов н/Д : Феникс, 2009. – 350 с.

2. Богомолова Н.Н. Социальная психология массовой коммуникации / Н.Н. Богомолова. – М. : Аспект Пресс, 2008. – 191 с.

3. Ворошилов, В.В. Журналистика / В.В. Ворошилов. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 1999. – 304 с.

4. Лазутина, Г.В. Основы творческой деятельности журналиста : учебник для вузов по специальности «Журналистика» / Г.В. Лазутина. – М. : Аспект пресс : Изд-во Моск. ун-та, 2000. – 238 с.

5. Основы творческой деятельности журналиста / под ред. С.Г. Корконосенко. – СПб. : Знание, 2000. – 272 с.

6. Пронина, Е.Е. Психология журналистского творчества / Е.Е. Пронина. – М. : КДУ, 2006. – 368 с.

7. Рощин, С.К. Психология и журналистика / С.К. Рощин. – М. : Наука, 1989. – 192 с.

8. Самарцев, О.Р. Творческая деятельность журналиста: очерки теории и практики: учебное пособие для вузов / О.Р. Самарцев. – Москва: Академический проект: Гаудеамус, 2009. – 526 с.

9. Сосновская А.М. Журналист : личность и профессионал (психология идентичности) / А.М. Сосновская. – СПб. : Роза мира, 2005. – 206 с.

10. Свитич, Л.Г. Введение в специальность : Профессия : журналист / Л.Г. Свитич. – М. : Аспект Пресс, 2007. – 255 с.

11. Черникова, Е.В. Основы творческой деятельности журналиста : учебное пособие для высших учебных заведений по специальности 021400 «Журналистика» / Е.В. Черникова. – М.: Гардарики, 2005. – 287 с.

12. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка беларускай мовы : Вучэб. дапам. для фак. журналістыкі / М.Я. Цікоцкі. – Мінск. : Універсітэцкае, 1995. – 294 с.

13. Цікоцкі, А.М. Стылістыка газетных жанраў : Дапаможнік для студ. журналісцкіх спец. / А.М. Цікоцкі. – Мінск. : БДУ, 2003. – 23 с.

### *Дадатковая*

1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ / У.В. Анічэнка, У.Д. Еўтухоў, В.А. Ляшчынская, Т.І. Тамашэвіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 255 с.

Репозиторий ВГУ

2. Берёзкина, О.П. Социально-психологическое воздействие СМИ / О.П. Берёзкина. – М. : Академия, 2009. – 240 с.
3. Доценко, Е.Л. Психология манипуляции : феномены, механизмы и защита / Е.Л. Доценко. – СПб. : Речь, 2003. – 304 с.
4. Дубовік, С.В. Даведнік журналіста / С.В. Дубовік. – Мінск: Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 2006. – 221 с.
5. Іўчанкаў, В.І. Дыскурс беларускіх СМІ : Арг. публіцыст. тэксту / В.І. Іўчанкаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – 256 с.
6. Криницин, Е. Акулы интервью : 11 мастер-классов / Е. Криницин. – М. : Альпина Паблишерз, 2011. – 182 с.
7. Корконосенко, С.Г. Теория журналистики : моделирование и применение / С.Г. Корконосенко. – М. : Логос, 2010. – 248 с.
8. Олешко, В.Ф. Психология журналистики / В.Ф. Олешко. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2008. – 240 с.
9. Соловьев, А.И. Основы информационно-коммуникационной деятельности / А.И. Соловьёв. – Минск : БГУ, 2009. – 191 с.
10. Тертычный, А.А. Трансформация жанровой структуры современной периодической печати / А.А. Тертычный // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 10, Журналистика. – 2002. – № 2. – С. 54–63.
11. Шостак, М.И. Репортер : профессионализм и этика / М.И. Шостак. – М. : РИП-холдинг, 2001. – 165 с.

Репозиторий ВГУ

## V. ПЫТАННІ ДА ТЭАРЭТЫЧНАГА ЭТАПА ЭКЗАМЕНУ

1. Агульная характарыстыка сродкаў масавай інфармацыі. Сістэма СМІ Беларусі.
2. Агульныя заканамернасці і формы творчай дзейнасці журналіста.
3. Журналісцкая творчасць і літаратурна-мастацкая: агульнае і адрознае.
4. Прафесійныя абавязкі і прафесійныя характарыстыкі асобы журналіста.
5. Журналісцкае майстэрства: этапы станаўлення.
6. Інфармацыя як асноўная катэгорыя тэксту.
7. Віды інфармацыі (зместава-канцэптуальная, зместава-фактуальная).
8. Спецыфіка і функцыі медыя-тэксту.
9. Асноўныя спосабы атрымання інфармацыі. Сістэма інфармавання журналістаў.
10. Тыпы крыніц інфармацыі, іх характарыстыка. Спецыфіка інфармацыйнага асяроддзя.
11. Факт у журналістыцы і мастацкай літаратуры. Ацэнка факта ў журналісцкім творы.
12. Паняцці “рэальны факт” і “вербальны факт”. Прынцыпы адбору фактаў.
13. Навіна як аснова журналістыкі факта. Навіна і сенсацыя.
14. Спецыфіка лагічнай будовы журналісцкага твора.
15. Твор і тэкст: дыфферанцыяцыя паняццяў. Узаемадзеянне розных відаў творчасці.
16. Паняцце публіцыстыкі і спецыфіка публіцыстычнага твора. Адметнасць яго прачытання і разумення.
17. Паняцце ідэі журналісцкага твора. Стадыі стварэння матэрыялу. Сістэма фактаў у журналісцкім творы.
18. Структура і кампазіцыя журналісцкага тэксту. Тыповыя віды кампазіцыі. Знешняя і ўнутраная кампазіцыя.
19. Журналісцкі твор і функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).
20. Інфармацыйная культура грамадства і спецыфіка журналісцкай творчасці.
21. Фактары папулярнасці (эфектыўнасці) журналісцкага твора.
22. Віды загалоўкаў. Намінатыўная, інфарматыўная, камунікатыўная, рэкламная функцыі загалоўкаў.
23. Правілы для загалоўкаў на газетнай паласе і ў інтэрнэт-выданні.

Репозиторий ВГУ

24. Паняцце жанру ў журналістыцы. Жанраўтваральныя фактары ў СМІ рознай тыпалогіі.

25. Навасційная журналістыка і праца рэпарцёра. Навіна – аснова інфармацыйных жанраў.

26. Спецыфіка інфармацыйных жанраў (заметка, рэпартаж, інтэрв'ю).

27. Агульнае ўяўленне пра аналітычныя жанры.

28. Галоўныя характарыстыкі замалёўкі, нарыса, эсэ.

29. Фельетон і памфлет у сучаснай журналістыцы.

30. Інфармацыйнае поле і інфармацыйная норма ў СМІ. Маўленчая культура журналіста.

31. Публіцыстычны стыль і газетна-публіцыстычны падстыль. Ідывідуальны стыль журналіста.

32. Даступнасць мовы СМІ – галоўная ўмова эфектыўнасці журналісцкага выступлення.

33. Багацце маўлення журналіста як сведчанне майстэрскага валодання словам.

34. Маўленчая сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і яе ўплыў на мову СМІ.

35. Экспрэсіўнасць мовы публіцыстычных тэкстаў. Слоўныя штампы і шаблоны ў медыя-тэксце.

36. Маўленчыя сродкі ўздзеяння на свядомасць: стылістычныя фігуры і тропы.

37. Размоўныя словы, жаргон: плюсы і мінусы іх выкарыстання ў журналісцкім творы.

38. Стылістычныя фігуры як сродкі падтрымання кантакту з аўдыторыяй.

39. Метафарызацыя мовы СМІ. Паўторы розных тыпаў, іх роля ў публіцыстычным творы.

40. Інтэртэкстуальнасць як моўна-стылёвая прыкмета сучаснай публіцыстыкі.

Репозиторий ВГУ

## VI. ПРАГРАМА БЕСПЕРАПЫННАЙ КАРЭСПАНДЭНЦКАЙ ПРАКТЫКІ

Бесперапынная карэспандэнцкая практыка прадугледжваецца для студэнтаў спецыяльнасцей 1-02 03 05 “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка” (1, 2, 3, 4, 5 курсы), 1-21 05 01-07 “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах” (3, 4, 5 курсы), праводзіцца на базе рэдакцыі газеты “Мы і час” і мае на мэце азнаямленне са спецыфікай працы рэдакцыі, журналіста і літаратурнага работніка, замацаванне тэарэтычных ведаў і прафесійных уменняў на кожным этапе навучання.

Гэта прадугледжвае выкананне наступных задач:

- замацаваць атрыманыя тэарэтычныя веды пра журналістыку як сферу масава-інфармацыйнай і літаратурна-творчай дзейнасці;
- набыць вопыт стварэння літаратурных тэкстаў і іх рэдагавання;
- навучыць практыкантаў выкарыстоўваць інфармацыйныя жанры;
- навучыць методыцы карэктарскай працы, сфарміраваць карэктарскія ўменні;
- пазнаёміць з макетаваннем газетнай паласы.

Бесперапынная карэспандэнцкая практыка студэнтаў у рэдакцыях сродкаў масавай інфармацыі пачынаецца з вучэбна-азнаямляльнай, якая з’яўляецца важным этапам падрыхтоўкі будучага літаратурнага работніка рэдакцыі, і працягваецца літаратурна-карэспандэнцкай. Кожны студэнт ва універсітэцкай газеце працуе па індывідуальным графіку, які абавязкова прадугледжвае працу ў рэдакцыйнай установе або па заданні рэдакцыйнай установы за яе межамі не менш за дзве гадзіны ў тыдзень.

Для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 05 “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка” вучэбна-азнаямляльная практыка адбываецца на працягу 2 і 3 семестраў (I–II курс), літаратурна-карэспандэнцкая практыка адбываецца на працягу 4 – 10 семестраў (III –V курс).

Для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01-07 “Беларуская філалогія. Літаратурная работа ў газетах і часопісах” вучэбна-азнаямляльная практыка адбываецца на працягу 5 і 6 семестраў (III курс), літаратурна-карэспандэнцкая практыка адбываецца на працягу 7 – 10 семестраў (IV –V курс).

Рэпазіторый ВДУ

## Справаздачная дакументацыя студэнта

1. Адзін раз у семестр студэнт прадстаўляе справаздачу аб праведзенай рабоце (па прынятай форме).
2. Студэнт у час практыкі вядзе дзённік, у якім запісвае свае назіранні за дзейнасцю рэдакцыі, падрабязна фіксуе асабістую працу і бібліяграфію ўласных публікацый. Адзін раз у месяц дзённік правярае метадыст.
3. Адзін раз у семестр студэнт прадстаўляе копіі матэрыялаў, якія выйшлі падчас наведвання практыкі, наклееныя на лісты паперы фармату А4. Публікацыі завяраюцца подпісам метадыста кафедры.

## Прыкладная схема справаздачы

Справаздача аб ***(выбраць патрэбнае <u>вучэбна-азнаямляльнай, літаратурна-рэдакцыйнай</u>)*** практыцы

студэнта________ групы__________________факультэта

у газеце____________________________________

Прозвішча, імя, імя па бацьку_________________________

за перыяд з__________па____________ 2012 года.

- ❖ Агульная характарыстыка газеты, у якой праходзіць практыка.
- ❖ Аналіз матэрыялаў іншых аўтараў, адрэдагаваных практыкантамі.
- ❖ Якія свае матэрыялы напісаны за перыяд практыкі (па заданнях рэдакцыі, па ўласнай ініцыятыве) і якія з іх былі прыняты да друку.
- ❖ Якія метады збору інфармацыі былі выкарыстаны пры падрыхтоўцы ўласных матэрыялаў.
- ❖ З якімі цяжкасцямі сустрэўся практыкант у час працы ў рэдакцыі.
- ❖ Ступень паспяховасці выканання праграмы практыкі.

## Дзённік студэнта-практыканта

Студэнт у час бесперапыннай практыкі вядзе дзённік, у якім запісвае свае назіранні за дзейнасцю журналістаў у рэдакцыі. У дзённіку павінен быць адлюстраваны кожны этап дзейнасці студэнта-практыканта і асабліва падрабязна:

- ❖ рэдакцыйныя заданні;
- ❖ працэс збору інфармацыі і падрыхтоўкі да друку ўласных матэрыялаў;



Репозиторий ВГУ

**Форма дзённіка:**

Дзённік
студэнта-практыканта
___________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
факультэта___________групы

| № п/п | Дата, месца | Змест работы | Вынік, заўвагі |
|---|---|---|---|
| | | | |

Матэрыялы, змешчаныя ў дзённіку, выкарыстоўваюцца студэнтамі пры складанні справаздачы аб праведзенай працы за перыяд практыкі.

**Ацэнка практыкі**

Дзейнасць студэнта-практыканта ацэньваецца:

- за наяўнасць апублікаваных матэрыялаў на старонках газеты (асноўны паказчык);
- за наяўнасць падрыхтаваных матэрыялаў;
- за выкананне індывідуальнага графіка;
- за авалоданне практычнымі ўменнямі літаратурнага супрацоўніка;
- за вядзенне дакументацыі.

Практыка ацэньваецца як паспяховая або непаспяховая.

- Практыка лічыцца паспяховай, калі студэнт: выявіў агульную і метадычную падрыхтоўку па спецыяльнасці; праявіў здольнасць самастойна распрацоўваць тэму, падрыхтаваў матэрыялы да друку, якасна правёў рэдактарскі аналіз; выканаў патрэбную колькасць гадзін практыкі; надрукаваў вызначаную на семестр колькасць матэрыялаў; сістэматычна адлюстроўваў сваю працу ў дзённіку; падрыхтаваў усю неабходную дакументацыю.
- Практыка лічыцца непаспяховай, калі студэнт: не праявіў ініцыятывы або творчых пошукаў пры распрацоўцы тэм для газеты, няякасна і несвоечасова выконваў заданні рэдакцыі; не надрукаваў матэрыялаў; не выявіў схільнасцей і жадання да працы пазаштатнага карэспандэнта, не вёў неабходнай дакументацыі.



Репозиторий ВГУ

**Памятка студэнту-практыканту**

Студэнт-практыкант абавязаны:

1. Вывучаць тэматычны змест перыядычнага выдання, на базе якога адбываецца практыка.
2. Высветліць спецыфіку чытацкай аўдыторыі выдання.
3. Атрымаць уяўленне пра структуру рэдакцыі, арганізацыю яе работы.
4. Своечасова весці дзённік бесперапыннай практыкі і адзін раз у месяц паказваць яго метадысту.
5. Працаваць па індывідуальным графіку, які абавязкова прадугледжвае працу ў рэдакцыйнай установе або па заданні рэдакцыйнай установы за яе межамі не менш чым 2 гадзіны ў тыдзень.
6. Рыхтаваць да друку ўласныя матэрыялы. Кожны студэнт абавязаны надрукаваць у газеце адзін матэрыял на працягу 2-х месяцаў (любы інфармацыйны або іншы жанр).
7. Вывучаць прынцыпы вёрсткі газетнай паласы, прынцыпы адбору матэрыялаў да друку.
8. Падпарадкоўвацца рэжыму працоўнага дня рэдакцыі, нормам яе ўнутранага распарадку.
9. Назіраць і ўдзельнічаць у падрыхтоўцы нумароў да друку.
10. Праяўляць ініцыятыву і прапаноўваць тэмы для публікацый.
11. Строга выконваць правілы тэхнікі бяспекі і аховы працы.
12. Несці адказнасць за правільнасць і дакладнасць фактаў у тэкстах, падрыхтаваных да друку.

Репозиторий ВГУ